# ПОЛЬБЮРО ГОМЕЛЬСКАГА ГУБКАМА РКП(Б) Ў 1919-1926 ГГ.

**П.А. Ліцвінаў**

Умовы грамадзянскай і савецка-польскай вайны, блізасці Польшчы і станаулення маладой савецкай дзяржавы патрабавалі ад яе умацавання заходніх межаў і неабходнасці правядзення польскай нацыянальнай палітыкі. У лістападзе 1919 г. у Гомелі было створана Польбюро пры губкаме РКП(б) для агітацыі сярод польскіх бежанцаў і пралетарыяту. Аднак у 1919-1920 гг. работа амаль не праводзілася. У сакавіку 1921 г. адбыўся 10-ы з'езд РКП(б), які прадугледжваў стварэнне трохступенчатай нацыянальнай аўтаноміі (у адносінах да палякаў Гомельшчыны – толькі нацсельсаветы), вылучэнне палякаў на адпаведныя пасады дзяржаўнай адміністрацыі і парткамаў, перавод партыйных, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый на нацыянальную мову, развіццё нацыянальнай адукацыі, культуры і навукі на польскай мове. Канчатковай мэтай "ekspeгymenta polonijnego " была поўная саветызацыя мясцовых палякаў, фарміраванне пралетарскага інтэрнацыяналізма і савецкага патрыятызма.

У 1921 г. работа Польбюро Гомельскага губкама інтэнсіфікавалася, але чыстка партыі канца 1921 г. і пачатак так званага "НЭПа нацыянальнага" фактычна зліквідавалі Польбюро і стварылі русіфікатарска-шавіністычны настрой у парткамах, што не дазволіла разгарнуць працу Польбюро нават да 1923 г.

Яшчэ ў лістападзе 1921 г. на III Усерасійскім з'ездзе палякаў-камуністаў было пастаноўлена змяніць вектар дзейнасці Польбюро на карысць мясцовага насельніцтва, у тым ліку і мясцовых сялян. Паражэнне Тухачэўскага пад Варшавай у 1922 г. адцягвала сусветную рэвалюцыю на невядомы тэрмін і рабіла неабходным актывізацыю польскай нацпалітыкі.

Сапраўдная работа пачалася ў др.п. 1924 г: ствараліся нацсельсаветы, павялічылася колькасць школ, пачалася праца сярод моладзі, жанчын, дзяцей, пашырылася кааперацыя, вялася культурная работа, савецкая агітацыя і анты-

рэлігійная прапаганда. Паступова варожасць палякаў да СССР, іх моцны нацыяналізм, рэлігійны фанатызм былі зломлены.

Асноўнымі перашкодамі для дзейнасці Польбюро былі адсутнасць сродкаў на правядзенне яго мерапрыемстваў, кваліфікаваных кадраў, разумеючых сэнс "eksperymenta polonijnego" і валодаючых польскай мовай, невялікі штат, малыя паўнамоцтвы, недавер палякаў да савецкай нацпалітыкі і варожы настрой парткамаў. Пералом у дзейнасці Польбюро адбыўся тады, калі губкам, а потым і нізавыя парткамы зразумелі сэнс і важнасць польскай нацпалітыкі і іх рэальныя захады растапілі недавер мясцовых палякаў. У 1926г. Польбюро Гомельскага губкама ў сувязі з адыходам губерні да БССР была перападпарадкавана Польбюро ЦК КП(б)Б.